# Прамова таварыша Ц. Я. КІСЯЛЁВА

Дарагі таварыш Новатны!
Дарагі таварыш Ленарт!
Дарагія чэхаславацкія госці, сябры!
Таварышы!

Дазвольце ад імя Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі, Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў Беларускай ССР, ад імя працоўных рэспублікі сардэчна вітаць Першага сакратара Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Чэхаславакіі, Прэзідэнта Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікі таварыша Антаніна Новатнага, выдатнага дзяржаўнага кіраўніка Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікі, вядомага дзеяча міжнароднага камуністычнага і рабочага руху, нашага вялікага шчырага друга.

Мы горача вітаем усіх членаў партыйна-дзяржаўнай дэлегацыі і ў вашай асобе працавіты таленавіты народ Чэхаславакіі, яго баявы, выпрабаваны авангард — Камуністычную партыю.

Мы глыбока ўдзячныя вам за сяброўскі візіт у сталіцу Беларусі—горад Мінск, за тое, што, нягледзячы на кароткачасовае знаходжанне ў Мінску, вы знайшлі магчымым наведаць адну з пасляваенных будоўляў нашай рэспублікі—камвольны камбінат, азнаёміцца

**(Заканчэнне на 3-й стар.).**

